Источник: "Настаўніцкая газета" - 2015-01-10

# Дачыненне да важных спраў

**Спіс лаўрэатаў спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 года прадстаўлены імёнамі прафесіяналаў у розных галінах — ад рэстаўрацыі і аднаўлення гісторыка-культурных каштоўнасцей да музейнай справы і ад кінавідэамастацтва, сучаснага выяўленчага мастацтва да народных рамёстваў. І ўсё гэта, сапраўды, імёны, імёны, імёны — добра вядомыя, прынамсі, у канкрэтна сваім прафесійным асяроддзі, але і не толькі. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што і тут, як і ў выпадку з лаўрэатамі прэміі Прэзідэнта Беларусі "За духоўнае адраджэнне", не абышлося без прадстаўнікоў сістэмы дадатковай адукацыі Беларусі. Але аб гэтым крыху пазней.**

У сферы кіно і тэлебачання лаўрэатам спецыяльнай прэміі кіраўніка дзяржавы стаў аўтарскі калектыў тэлеканала "Сталічнае тэлебачанне" ў складзе дырэктара дырэкцыі спецыяльных праектаў Аляксея Адашкіна і карэспандэнта спецыяльнай службы карэспандэнтаў дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання Вольгі Макей за стварэнне цыкла дакументальных фільмаў "Шай-бу! Shai-BY!...". Трэба сказаць, што тэлежурналістам "Сталічнага тэлебачання" ў сваіх шасці фільмах сапраўды ўдалося паказаць хакейную справу ў вельмі шырокім плане. Тут знайшлося месца аповеду і пра гісторыю айчыннага і сусветнага хакея (журналісты пабывалі нават у Зале хакейнай славы ў Таронта), і пра сучасныя беларускія хакейныя каманды, і пра сённяшніх перспектыўных зусім маладых гульцоў — надзеі на паспяховую будучыню нашага хакея. Безумоўна, вялікая ўвага ў фільмах удзелена падрыхтоўцы і правядзенню апошняга чэмпіянату свету па хакеі ў нашай краіне, ужо афіцыйна прызнанага лепшым у гісторыі. Не абышлося і без рэтраспектыўных іскрынак, такіх як легендарная пераможная шайба Уладзіміра Копаця ў вароты шведаў. Хапіла ў фільмах і ўдумлівай спартыўнай аналітыкі спецыялістаў. Аўтары цыкла "Шай-бу! Shai-BY!..." бадай што змаглі раскрыць формулу поспеху ў хакеі.

Лаўрэатам прэміі стаў таксама галоўны спецыяліст прадпрыемства "Мінская спадчына" Сяргей Багласаў. Узнагарода прысуджана яму за значны асабісты ўклад у рэстаўрацыю і аднаўленне гісторыка-культурнага комплексу плошчы Свабоды з прылеглай забудовай у Мінску. Высокі прафесіяналізм і нераўнадушнасць да вельмі праблемнай справы рэстаўрацыі цэнтра нашай сталіцы не выклікаюць сумненняў. А яшчэ не будзем забываць, што арыгінальныя скульптуры, якія з'явіліся за апошні час на плошчы Свабоды, гэта таксама Багласаў-архітэктар.

Музейная справа прадстаўлена двума лаўрэатамі. За вялікую навуковую і творчую работу па адраджэнні традыцый нацыянальнай культуры і асабісты ўклад у стварэнне экспазіцыі Музея гісторыі слуцкіх паясоў у Слуцку Мінскай вобласці спецпрэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь удастоены аўтарскі калектыў у складзе дацэнта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Людмілы Дамнянковай, дырэктара творча-эксперыментальнага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства "ГУДАРТ" Пятра Лабковіча і супрацоўніка Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Барыса Лазукі. А калектыў мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" атрымаў узнагароду за вялікі ўклад у захаванне гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне і стварэнне экспазіцыі ў паўднёва-ўсходняй казарме Цытадэлі Брэсцкай крэпасці "Музей вайны — тэрыторыя міру".

Прэмія прысуджана і ансамблю песні і танца "Медуніца" Магілёўскай абласной філармоніі, які ўнёс значны ўклад у захаванне і развіццё традыцыйнай беларускай музычнай культуры, за актыўную канцэртную дзейнасць. Ансамбль пастаянна ўдзельнічае ў розных абласных і рэспубліканскіх мерапрыемствах. Добра ведаюць яго і ў свеце. Майстэрству артыстаў "Медуніцы" апладзіравалі гледачы ў Германіі, Польшчы, Расіі, Малдове, Украіне, Кітаі і іншых краінах. Пры гэтым ансамбль ніколі не цураецца і выступленняў у сельскай глыбінцы. Дарэчы, асаблівае месца ў рэпертуары калектыву займаюць канцэртныя праграмы, створаныя на аснове аўтэнтычнага фальклору Магілёўскай вобласці. Да 70-годдзя Вялікай Перамогі "Медуніца" рыхтуе спецыяльны праект для ветэранаў вайны і працы, куды будуць уключаны як песні пра вайну вядомых расійскіх і беларускіх кампазітараў (Максіма Дунаеўскага, Леаніда Захлеўнага, Уладзіміра Карызны і інш.), так і традыцыйныя беларускія народныя песні, напоўненыя смуткам і радасцю. Прадставіць праект плануецца ў маі акурат да свята. Музычная частка праекта будзе суправаджацца арыгінальнай танцавальнай праграмай.

Калектыў Неглюбскага сельскага цэнтра ткацтва Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці ўдастоены ўзнагароды за значныя дасягненні ў справе адраджэння і развіцця народных промыслаў, захаванне і папулярызацыю традыцыйных тэхналогій вытворчасці неглюбскіх ручнікоў. "Вырабы нашых майстрых ахвотна набываюць замежныя турысты, якія часта наведваюць цэнтр. Не памылюся, калі скажу, што за межамі рэспублікі знаходзяцца ўжо тысячы неглюбскіх ручнікоў. Вельмі хочацца, каб з цягам часу яны змаглі стаць такім жа сімвалам Беларусі, як слуцкія паясы", — прызнаўся надоечы ў інтэрв'ю карэспандэнту БелТА дырэктар цэнтра Уладзімір Кавалёў.

Несумненна, заслужана ўключаны ў спіс лаўрэатаў і Цэнтр сучасных мастацтваў, які ўзнагароджаны за вялікі ўклад у прапаганду сучаснага выяўленчага мастацтва Беларусі і арганізацыю значных выставачных праектаў. Сапраўды, як не ўзгадаць тут такія ўнікальныя для Беларусі пачынанні, як выстава сучаснага мастацтва "Avant-gARTe. Ад квадрата да аб'екта", які сабраў тысячы аматараў мастацтва на розных арт-пляцоўках сталіцы; фестываль вулічных тэатраў у Верхнім горадзе (нарэшце рэалізаваная мара яго арганізатараў); беларуска-бразільскі фестываль стрыт-арта Vulica Brasil, які і сёння нагадвае пра сябе роспісамі сцен на вуліцах Кастрычніцай і Фабрычнай, і многія іншыя. Ведаючы дырэктара Цэнтра сучасных мастацтваў Наталлю Шаранговіч як вельмі ініцыятыўнага прафесіянала, можна не сумнявацца, што цэнтр падорыць нам яшчэ нямала сюрпрызаў.



Лаўрэат спецпрэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтваў 2014 года – аўтарскі калектыў у складзе супрацоўнікаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алены Боганевай і Тамары Варфаламеевай, педагога Цэнтра дадатковай адукацыі "Ветразь" Кастрычніцкага раёна Мінска Міколы Козенкі.

Не засталіся без увагі дзяржавы і некаторыя мастакі. Так, прэміі ўдастоены прафесар кафедры малюнка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзімір Ганчарук за вялікі асабісты ўклад у развіццё выяўленчага мастацтва Беларусі і выхаванне таленавітай моладзі. А мастак-скульптар член Беларускага саюза мастакоў Сяргей Бандарэнка атрымаў узнагароду найперш за стварэнне высокамастацкіх твораў манументальнай і станковай скульптуры. Нагадаем, што менавіта Сяргей Бандарэнка — аўтар коннай статуі легендарнага князя Альгерда, якая ў чэрвені мінулага года была ўстаноўлена ў Віцебску.

Нарэшце, за падрыхтоўку фундаментальнага навуковага 6-томнага выдання "Традыцыйная мастацкая культура беларусаў" спецпрэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтваў узнагароджаны аўтарскі калектыў у складзе супрацоўнікаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алены Боганевай і Тамары Варфаламеевай, а таксама педагога Цэнтра дадатковай адукацыі "Ветразь" Кастрычніцкага раёна Мінска Міколы Козенкі. Апошняга я якраз і меў на ўвазе, калі ў пачатку казаў, што ў спіс лаўрэатаў спецпрэмій трапіў чалавек з сістэмы дадатковай адукацыі Міністэрства адукацыі.

Як паведамляе БелТА са слоў Тамары Варфаламеевай, гэты шасцітомнік, работа над якім вялася на працягу 20 гадоў, цікавы не толькі для беларусаў, але і для прадстаўнікоў іншых краін. Выданнем ужо актыўна карыстаюцца даследчыкі Расіі і Літвы, зацікавіліся вучоныя Сербіі. У дзесяці кнігах (апошнія чатыры тамы выходзілі ў дзвюх кнігах) сабрана вялікая колькасць матэрыялу: тут і народны каляндар, і песні, і танцы, і народная проза, і традыцыйны касцюм, і беларускі тэкстыль. "Калі мы задумвалі гэтае выданне, то адразу паставілі перад сабой звышзадачу зрабіць сінхронны зрэз традыцыйнай культуры на стыку другога і трэцяга тысячагоддзя, беларусы ж, як ніхто, змаглі захаваць сваю традыцыйную культуру да гэтага часу. Яна была, ёсць і будзе, няхай і ў іншых формах", — цытуе БелТА Тамару Варфаламееву.

А мне ўсё ж хацелася б вярнуцца да Міколы Козенкі. Як хапае яго займацца з дзеткамі танцамі ў Цэнтры дадатковай адукацыі "Ветразь", удзельнічаць у такіх грандыёзных фундаментальных праектах, як "Традыцыйная мастацкая культура беларусаў", нязменна кіраваць Рэспубліканскім фестывалем фальклорнага мастацтва "Берагіня", весці танцавальныя заняткі ў Школе традыцыйнага мастацтва гурта GUDA БДУКіМ, заўсёды быць там, там і там дзе толькі будзе традыцыйны народны танец? Адказ у мяне знаходзіцца толькі адзін: яму проста ў радасць усё гэта... І якраз, мабыць, такія людзі, якім у радасць займацца любімай справай на карысць дзяржавы і людзей, становяцца лаўрэатамі прэмій.

...Літаральна на днях у рэдакцыю прыйшоў допіс ад сям'і ўдзельнікаў гурта GUDA Таццяны, Сяргея, Івана і Марыі Палазнікоў. Мне здаецца, ёсць добрая нагода працытаваць урывак з гэтага допісу.

"Танцавальныя заняткі ў Школе традыцыйнага мастацтва гурта GUDA вядзе вядомы ў Беларусі этнахарэограф Мікалай Аляксеевіч Козенка, які прыкладае велізарныя намаганні, каб аднавіць, захаваць і зрабіць больш распаўсюджанай у нашай краіне культуру традыцыйнага беларускага танца. Гэта таленавіты педагог, які вельмі добра разумее дабратворны ўплыў танца на чалавека, дапамагае адчуць тое духоўнае, што закладзена ў кожным руху. Менавіта адчуць, бо танец, як і музыка, накіраваны да пачуццяў.

Пластыка руху дазваляе чалавеку засвойваць рытмы, спасцігаць сваё цела, гарманізаваць сваё існаванне з навакольным асяроддзем. Мікалай Аляксеевіч ставіць сваёй мэтай навучыць танцу любога чалавека. І ў гэтым таксама закладзена вялікая мудрасць, бо, засвойваючы простыя рухі, кожны чалавек спасцігае свет прыроды, яе рытмы, вучыцца яднанню з прыродай. Невыпадкова раней у народзе не вучылі танцам — танцаваць было так жа натуральна, як і жыць.

Адзін з важных педагагічных прынцыпаў Мікалая Аляксеевіча — вучыць кожнага танцора імправізацыйнай свабодзе, імкненню да самавыяўлення, да разняволення. Навучаючы простым танцавальным рухам, Мікалай Аляксеевіч прапаноўвае іх розныя камбінацыі, якія прымушаюць прыкладаць шмат намаганняў для ўспрымання і запамінання. Гэта абуджае азарт пераадолець цяжкасці, а таксама развівае памяць, увагу, рухальную актыўнасць. Кожная новая камбінацыя ўспрымаецца як пластычны эцюд, прызначаны натхніць вучняў на ўласную творчасць. У занятках М.А.Козенкі прысутнічае вялікая павага да кожнай асобы, закладзены глыбокі гуманістычны сэнс. Гэта майстар высокай культуры зносін і выкладання.

Дзейнасць усяго творчага калектыву GUDA (кіраўнік гурта — Вікторыя Міхно, дырэктар — Алена Каліноўская) і дзейнасць Мікалая Аляксеевіча Козенкі прымушаюць ганарыцца сваёй краінай, сваёй культурай. Яны ўносяць новы сэнс у наша штодзённае, поўнае спешкі і вырашэння надзённых праблем жыццё. Узнікае адчуванне дачынення да важных спраў і падзей, напоўненых радасцю і добразычлівымі зносінамі. З'яўляецца адчуванне прыгажосці і гармоніі, якая прыходзіць у тваё жыццё праз святло, якое азарае сэрцы людзей самых розных прафесій, але аб'яднаных любоўю да народнай культуры, народнага танца".

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*